Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-09-14

# Заўтра — Дзень бібліятэк

Да яго падрыхтаваліся ўсе скарбніцы Беларусі. Галоўны дыямент — Нацыянальная бібліятэка Беларусі — запрашае сёння на імпрэзу "У гасцях у Каралевы Кнігі". Сустрэча больш разлічана на хлопчыкаў і дзяўчынак — будучых актыўных чытачоў. А сёння ім прапануюць захапляльнае падарожжа па залах бібліятэкі, наведванне музея кнігі і аглядная пляцоўкі, сустрэчы з супрацоўнікамі. Дзецям пакажуць розныя па памеры кнігі, прачытаюць любімыя старонкі. Мастацкае ўспрыманне пачутага яны змогуць увасобіць тут жа — у малюнках. Усе яны будуць на тэму "Кніжкін дом — бібліятэка".

У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сёння — прэс-канферэнцыя "Новыя магчымасці інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання: выкарыстанне інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій і інтэрнэт". Традыцыйна ў гонар святкавання Дня бібліятэк арганізуецца бясплатны запіс у скарбніцу. Акрамя таго, цягам гэтага тыдня чытачы ўдзельнічалі ў акцыі "Мяняем кнігу на кнігу" і ў тэматычным апытанні. На выхадзе з бібліятэкі наведвальнікі адказвалі на пытанне "Як вас сёння абслугоўвалі?"

**Ярына РЫТАМІНСКАЯ**

Ярына Рытамінская. Заўтра – Дзень бібліятэк